ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 „
6 месяцаў	1 р. 80 „
1 год	3 р. 60 „

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.

Кошт асобнага №—2 кап.

№ 202 (1471) ПАНЯДЗЕЛАК, 31 жніўня 1931 г.

Пасьля ўтварэньня коаліцыйнага ўраду ў Ангельшчыне

Ужо сам факт зьяўленьня на сцэне коаліцыйнага ўраду з рабочай партыі, лібэралаў і консэрватараў таворыць аб тым, да якой астраты прышло разьвіцьцё экономічнага крызісу ў Ангельшчыне ў сувязі з усеагульным пасьляваенным крызісам сусьветнага капіталізму.

Навошта патрабавалася гэта новая перастаноўка сіл партый буржуазіі ва ўрадзе? Хіба „рабочы" урад Ангельшчыны кепска выконваў ролю праваднікa ідэй брытанскага імпэрыялізму? Не „рабочы" урад быў заядлым рабаўнікам рабочае клясы, працоўных Ангельшчыны і колёніяльных народаў. Ён верна і цьвёрда праводзіў ідэі брытанскага імпэрыялізму.

А можа гэта перастаноўка патрабавалася таму, што проста Макдональд хацеў пайсьці на коаліцыю з лібэраламі і консэрватарамі? Не. Пры іншых умовах Макдональд на гэта ніколі не пайшоў-бы.

Адстаўка „рабочага" (Леборысцкага) ураду зьяўляецца вынікам рэзкага абвастраньня і паглыбленьня экономічнага крызісу Ангельскага капіталізму, насьпяваньня фінансавага крызісу і магутнага росту рэволюцыйнага руху.

„Рабочы" урад проста не адважыўся надалей узяць на сябе адказнасьць і быць начале генэральнага наступу на рабочую клясу, працоўныя масы і колёніяльныя народы, ажыцьцявіць сваю програму „экономіі", аб якой мы ўжо пісалі. У гэтым і месьціцца прычыны такой скорасьпешнай адстаўкі „рабочага" ураду Макданальда і ўтварэньня коаліцыйнага ўраду з лібэраламі і консэрватарамі, у які у якасьці прэм'ер-міністра ўваходзіць і Макданальд.

Новы ўрад адзначае сабою нішто іншае, як коаліцыю партый буржуазіі для яшчэ большага наступу на рабочую клясу, працоўныя масы і прыгнечаныя народы колёній.

Коаліцыйны ўрад ужо пасьпеў узяцца за ажыцьцяўленьне рабаўніцкай „экономіі", за „дэмократычныя" расправы з рэволюцыйным рухам. Ён ужо паказвае клыкі далейшай больш узмоцненай фашызацыі парлямэнцкай „дэмократыі".

Але-ж дзеля таго, каб забясьпечыць новаму ўраду правядзеньне сваёй палітыкі, тут, як і заўсёды прышлі на дапамогу ангельскія леборыстыя. Каб затрымаць рост абурэньня працоўных мас супроць новага рабаўнічага ўраду і аказаць свой уплыў на масы, яны прынялі позу „опозыцыі", Правадыры рэформісцкіх профсаюзаў „аказаліся здзіснутымі" ад удзелу ва ўрадзе. Генсавет трэд-юніонаў і леборысцкая партыя апублікавалі нават маніфэст „супроць" палітыкі „нацыянальнага" ўраду. Гомпстэдзкі камітэт леборыскай партыі, членам якога зьяўляецца Макдональд, вынес пастанову вывесьці яго з складу камітэту і абгаварыць пытаньне аб далейшым прабываньні Макданальда ў партыі. (Бачыце, якая рэволюцыйнасьць!?)

Але гэта „рэволюцыйнасьць" леборыстых ужо вядома рабочай клясе і працоўным масам Ангельшчыны. Компартыя зараз мобілізуе рабочыя і працоўныя масы супроць коаліцыйнага ўраду. Яна, і толькі яна, вядзе гэтыя масы па правільным шляху да іх соцыяльнага і нацыянальнага вызваленьня.

НАРАСТАЕ НАВАЛА ПРОЛЕТАРСКАГА ГНЕВУ

Грозны голас мільёнаў патрабуе спыніць зьверствы над палітвязьнямі фашысцкай Польшчы

Працоўныя масы замежных краін выступаюць супроць разгулу фашысцкіх разбойнікаў

Крывавы паход разьюшанага польскага фашызму на палітзьняволеных. увядзеньне новага турэмнога рэгляманту выклікалі магутнае абурэньне сярод шырокіх працоўных мас. У гарадох Польшчы адбыліся дэманстрацыі протэстаў. У Львове паміж дэманстрантамі і паліцыяй нядаўна адбылася сутычка дэманстрантаў з паліцыяй. У сувязі з рабочымі дэманстрацыямі, у Варшаве паліцыя правяла шматлікія арышты.

У іншых краінах таксама адбыліся дэманстрацыі і мітынгі протэстаў. Орган комуністычнай партыі Францыі „Юманітэ" паведамляе аб кампаніі протэстаў- якая разгарнулася у Францыі. У Парыжы адбыўся вялікі мітынг, скліканы комуністычнай партыяй. Праведзены мітынгі ў іншых мясцох

Кампанія протэстаў, якая ўсё больш нарастае. ёсьць магутная пагроза для фашысцкіх разбойнікаў.

Вы не адны,—мы з вамі

Комсамольскі сход, разам з беспартыйнай моладзьдзю і колгасьнікамі в. Валынцова, выносіць свой рашучы протэст супроць разгулу фашысцкага тэрору ў Польшчы і ўвядзеньня новага турэмнага рэжыму, у адносінах палітвязьняў.

Мы заклікаем усіх працоўных Польшчы, Зах. Беларусі і Зах. Украіны не пакладаючы рук весьці барацьбу з фашысцкай дыктатурай Пілсудзкага, памятаючы, што вы не адны. Разам з вамі 150 мільёнаў рабочых і працоўнага сялянства Савецкага Саюзу, якія пільна сачаць за барацьбою сваіх братоў.

Далоў фашысцкую дыктатуру Пілсудзкага!

На дапамогу братом

Рабочыя і служачыя Лепеля, у адказ крывавым катам Пілсудзкага на зьдзекі над працоўнымі Польшчы, узмацняюць работу МОПРу і ўносяць 200 руб.

— Работнікі Дзяржгандлю і кооперацыі Рагачэва ў карысьць палітзьняволеных Польшчы ўносяць 32 р. 50 к. Збор працягваецца. Узялі абавязацельства па 100 проц. ахопу членаў саюзу МОПРам.

— Колгасьнікі інтэрнацыянальнага колгасу „Серп і Молат", у адказ на адозву ЦК МОПРу Польшчы, адлічваюць 1 проц. месячнага заработку ў карысьць палітзьняволеных і іх сем'яў. Уборку лёну абяцаюць скончыць на 1 дзён раней тэрміну, плян севу на чатыры дні раней. Павышаюць плошчу азімых на 96 проц. супроць мінулага году.

Заява тав. Літвінава

Па пытаньню пакту аб ненападзе паміж СССР і Польшчай

БЭРЛІН, 28. Нарком замежных спраў тав. Літвінаў прыняў сёньня прадстаўнікоў нямецкага і замежнага друку ў Бэрліне і зрабіў наступную заяву: „за апошні час у друку неаднократ зьяўляліся, а за апошні час і атрымалі асаблівую выпукласьць, весткі аб нібы пачатых, вядучыхся ці аднавіўшыхся перагаворах паміж савецкім і польскім урадамі аб заключэньні пакта аб ненападзе.

Ніякіх перагавораў не вялося і не вядзецца. Аб гэтым заяўлялася не адзін раз савецкім друкам і ТАСС'ам, але я лічу ня лішнім пацьвердзіць гэтыя заявы. Чуткі пра тое, што нібы савецкі ўрад у жніўні 1930 году аднавіў сваю прапанову, зьяўляюцца выдумкай. Савецкі ўрад ня меў повады паўтараць сваю прапанову, бо польскі ўрад не даваў яму ніякага повады думаць, што ён зьмяніў свае адносіны да Савецкага саюзу, бяручы назад высунутыя ім умовы.

Уручаны гэтымі днямі польскім пасланьнікам у Маскве панам Патэкам дакумант лішні раз пацьвердзіў нязьменнасьць здмоўных адносін польскага ўраду да пакту, бо ў дакуманце ня толькі пералічаны старыя ўмовы але і дадана новае. Уручаючы гэты дакумант, пан Патэк не рабіў прапановы аб аднаўленьні перамоў, але і сам тлумачыў уручэньне дакуманту жаданьнем падагуліць вынікі перамоў 1926-27 гадоў. Напярэдадні ўручэньня дакуманту пан Патэк быў у мяне і ні словам нават не абмовіўся аб будучым уручэньні дакуманту і наогул аб пакце аб ненападзе, паведаміўшы, што ён выяжджае ў водпуск.

Застаецца толькі дадаць, што ўзаемаадносіны паміж Польшчай і СССР ня былі прадметам перамоў паміж СССР і трэцімі краінамі.

Савецкія прапановы аб заключэньні пакту прыняты і ажыцьцёўлены да гэтага часу толькі Нямеччынай, Турцыяй, Літвой, Пэрсіяй і Аўганістанам. Да ліку гэтых краін мы спадзяемся аднесьці і Францыю, у перамовах з якою пакуль што ня сустракаецца ніякіх цяжкасьцяй. Само сабою зразумела, што мы імкнемся да палепшаньня нашых узаемаадносін з Польшчай, але гэта ня можа быць дасягнута шляхам распаўсюджваньня чутак аб няісную́чых перамовах. Гэта можа выклікаць толькі раздражненьне і полеміку, чаго трэба ўнікнуць. Я вымушан зрабіць гэту заяву ў інтарэсах савецка-польскіх узаемаадносін.

* * *

У гэты-ж дзень Нарком замежных спраў тав. Літвінаў меў гутарку з міністрам замежных спраў Курцыусам.

А. ЧАРНУШЭВІЧ
Заг. культпропам ЦК КП(б)Б

ЗА ЛЕНІНСКУЮ ВУЧОБУ*)

Посьпехі на фронце соцыялістычнага будаўніцтва значна павысілі аўторытэт нашай партыі і давер'е к ёй з боку шырокіх рабочых і працоўных мас, гэта знайшло сваё яскравае адлюстраваньне ў шпаркіх тэмпах узросту нашай партыі за лік лепшых элемэнтаў рабочае клясы і колгасьнікаў. За апошнія 6 месяцаў (студзень-чэрвень 31 г.) у рады КП(б) прынята 7516 новых кандыдатаў партыі. Вельмі значная частка нова прынятых у партыю кандыдатаў ня мае яшчэ клясавай загартоўкі, не прайшлі суровай школы барацьбы на капіталістычных прадпрыемствах, не прайшлі школы грамадзянскай барацьбы. барацьбы супроць контр-рэволюцыйнага трацкізму і правага ўхілу.

Задача марксысцка-ленінскага выхаваньня нашай партыі, асабліва маладых членаў і кандыдатаў партыі, як адна з неабходнейшых умоў павышэньня ба здольнасьці партыі і яе далейшых перамог,—набывае асабліва важнае значэньне.

Партыйная вучоба—адзін з магутных сродкаў марксысцка-ленінскага выхаваньня—павінна стаць магутнай зброяй партыі ў барацьбе за генэральную лінію, у барацьбе з правым і „левым" опортунізмам, з прымірэнчымі да іх адносінамі.

Між тым, становішча партыйнай вучобы ў КП(б)Б на сёньняшні дзень застае ца нездавальняючым і не адпавядае тым вялізарным адказьнейшым задачам, якія стаяць перад партыяй.

У зімовы пэрыод ахоп усімі відамі партыйнай вучобы па КП(б)Б складаў: 37 проц. гарадзкіх організацый і 69 проц. вясковых, з іх кандыдаты партыі былі ахоплены на 45 проц. пры наведваньці ў сярэднім 50—60 проц. Толькі паасобныя райпарторганізацыі, узьняўшыя партвучобу на належную палітычную вышыню, дабіліся значных посьпехаў у гэтай справе, ахапіўшы вучобай 80-90-100 проц. парторганізацыі. У летні пэрыод работа значна аслабла, і ў некаторых раёнах зараз не існуе ні аднэй партшколы, ні аднаго гуртка. Прычым якасьць вучобы як па зьместу, так і па форме жадае многа лепшага.

Дзе прычыны такога становішча? 1-я недастатковасьць увагі значнай часткі райкому к пытаньню партыйнай вучобы, даходзячая ў некаторых выпадках да опортуністычнай недаацэнкі партыйнага выхаваньня.

2-я прычына—адарванасьць партвучобы ад практычнай работы, няўменьне ўвязаць партасьвету з практыкай соц. будаўніцтва, ў выніку чаго партвучоба ў большасьці праходзіць ізолявана ад практычнай работы, схолястычна і, бязумоўна, не зацікаўлівае партыйцаў.

3-я—зусім недастатковае (у мінулым) асьвятленьне пытаньняў па партыйнай вучобе ў друку, які павінен (а нашы цэнтральныя газэты ў апошні час становяцца на гэты шлях) значна дапамагчы партыйнай вучобе.

4-я—бадай поўная адсутнасьць мэтодаў соцспаборніцтва і ўдарніцтва ў сыстэме партыйнае асьветы.

5-я—формы організацыі сеткі, якія ня былі дастаткова прыстасаваны да асаблівасьцяй вытворчасьці, таксама не садзейнічалі пасьпяховасьці партасьветы.

ЦК КП(б)Б праведзена рад мерапрыемстваў па палепшаньню опэрацыйнага кіраўніцтва парт.вучобай; пасылка ў раёны культпроп брыгад для дапамогі і інструктаваньня, заслухоўваньне дакладаў аб становішчы партыйнай асьветы на пасяджэньні сэкратарыяту ЦК і культпропнарада, рэгулярны выпуск мэтодраспрацовак, выданьне „Ленінскай вучобы" і інш.

У 11-ці пунктах праведзены міжраённыя дэкадныя курсы сельскага партактыву па пытаньнях падрыхтоўкі да ўборачнай кампаніі і асеньняй пасеўнаў кампаніі. Правядзеньне такіх курсаў, якія падрыхтоўваюць актыў вясковых парторганізацый да правядзеньня асобных галоўнейшых гаспадарча палітычных кампаній, неабходна праводзіць пэрыодычна. Скліканы і працуюць 6-ці месячныя курсы па падрыхтоўцы партпрацаўнікоў. У сельпаркомах организуюцца інстр, пропагандысцкія групы, комплектуюцца бібліотэкі. Аднак, становішча вучобы партыйнага актыву як у горадзе, так і на вёсцы застаецца нездавальняючым.

Неабходна значна пашырыць вучобу партактыву па радыё, аб чым ЦК КП(б)Б даны вычарпныя дырэктывы. Райкомам і ячэйкам неабходна больш сур'ёзна падыйсьці да комплектаваньня курсаў па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы актыву (Прылуцкі комвуз, СПШ і др.), маючы на ўвазе неабходнасьць поўнага выкананьня заданьняў ЦК, забясьпечваючы належны якасны падбор. Неабходна сыстэматычна (раз у м-ц) праводзіць у р-не 2-3 дзённыя курсы-нарады партактыву для прапрацоўкі актуальнейшых проблем сучаснага пэрыоду, організаваць і забясьпечыць рэгулярную працу гуртноў павышанага тыпу. Больш часта організоўваць лекцыі па асобных тэорэтычных пытаньнях з прысылкай лектароў з Менску, Віцебску і Гомеля.

Вялізарную ролю ва ўсёй сыстэме партасьветы адыгрываюць пропагандысцкія кадры, у якіх на сёньняшні дзень адчуваецца вострая недастача. У буйных гарадох працуюць курсы па падрыхтоўцы рабочых пропагандыстых з разьліку па 300 чалавек, працуюць курсы пры Комвузе Беларусі, якія падрыхтуюць да 80 пропагандыстых, праведзены курсы па падрыхтоўцы пропагандыстых для чыгуначнага і воднага транспорту, выпусьціўшыя 47 чал. намячаюцца курсы для падрыхтоўкі пропагандыстых для ільнаводных і жывёлагадоўчых раёнаў. Аднак разьлічваць, што ЦК забясьпечыць усю патрэбу раёнаў ў пропагандыстых было-б зусім памылковым. Неабходна кожнаму раёну забясьпечыць падрыхтоўку пропагандысцкіх кадраў на месцы. Між тым, да гэтага часу дырэктыву ЦК КП(б)Б аб організацыі ў раёнах курсаў пропагандыстых выканалі толькі 6 раёнаў якімі падрыхтавана 129 чал. Неабходна ўсім райкомам, дзе яшчэ ня створаны курсы, зараз-жа іх організаваць, каб забясьпечыць ўсю сыстэму партыйнай асьветы падрыхтаванымі пропагандыстымі. Кожны год значным тормазам у справе разгортваньня масавай сеткі партасьветы зьяўлялася адсутнасьць спазьненьне, недобраякаснасьць падручнікаў. Справа з імі на сёньнешні дзень застаецца ня зусім здавальняючай. Значная частка падручнікаў яшчэ не атрымана ад аўтараў (з Масквы). Аднак, самыя неабходныя падручнікі ўжо перакладзены на белмову і друкуюцца.

Галоўнейшымі задачамі, якія стаяць перад партыйнымі організацыямі ў галіне марксысцка-ленінскага выхаваньня. зьяўляюцца:

1-я—узьняць пытаньні партасьветы на большую палітычную вышыню, неабходна зразумець кожнай організацыі кожнаму комуністаму, што работа па марксысцка-ленінскаму выхаваньню павінна быць справай кожнай парторганізацыі і што кожная парторганізацыя нясе адказнасьць перад партыяй за становішча гэтага адказнейшага вучастку работы у такой жа меры як і за выкананьне першачарговых гаспадарчых задач.

Партыйна-савецкі друк (цэнтральныя. раённыя, насьценныя газэты, шматтыражкі, пэрыодычныя выданьні) павінен у значна большай ступені асьвятляць пытаньні марксысцка-ленінскага выхаваньня, даваць вопыты добрай працы, сыгналізаваць аб прарывах і мобілізаваць ўвагу на барацьбу з прарывамі.

2-й адказнейшай задачай зьяўляецца устанаўленьне вытворчага прынцыпу (цэх, зьмена, брыгада) і прыстасаваньне форм партсеткі к асаблівасьцям данай вытворчасьці (шкляная машына-аудаўн., дрэваапрац. транспорт) і сельскай гаспадаркі (жывёлагадоўля, тэхнічныя культуры, садова-агародніна).

У дырэктыўным лісьце ЦК КП(б)Б даны паказаньні ў гэтым напрамку.

Галоўнай і найбольш гнуткай формай, разьлічанай на 100 проц. ахоп кандыдатаў партыі. і ў абавязковым парадку, павінна зьявіцца каротка-тэрміновая, 2-5 месячная кандыдацкая школа, якая павінна быць арганізавана ў цэхах, ударных брыгадах, зьменах і інтэрнатах.

Партсетка на вёсцы павінна быць дыфэрэнцыявана і набліжана к вытворчым умовам і задачам колгасу, саўгасу і МТС. Асноўнай формай для ахопу ўсіх кандыдатаў партыі і колгасна-саўгаснага беспартыйнага актыву павінна зьявіцца школа-перасоўка з 2-х месячным тэрмінам навучаньня.

3-й адказнай задачай зьяўляецца ўвязка тэорэтычнай вучобы з практыкай соцыялістычнага будаўніцтва. Неабходна ўлічыць станоўчы вопыт некаторых парторганізацый у гэтым напрамку, аднак не дапускаючы ператварэньня школы, або гуртка, у сход ячэйкі, на якім разьбіраюцца бягучыя справы.

4-я задача—забясьпечыць сыстэматычнае опэрацыйнае дыфэрэнцыяванае кіраўніцтва партвучобай зьверху да нізу; высылаць для дапамогі і інструктаваньня на месцы брыгады, зьбіраць мэтоднарады, пасылаць мэтодраспрацоўкі, своячасова рэагаваць на прарывы. Асабліва трэба мець на ўвазе ідэолёгічна вытрыманы зьмест вучобы.

5-я задача—разгортваньне масавай палітычнай кампаніі па падрыхтоўцы і ўкомплектаваньню сеткі на асеньня-зімовы пэрыод. Гэты час зьяўляецца вельмі адказным, ад яго ў значнай ступені залежыць пасьпяховасьць працы партсеткі. Неабходна зараз-жа паставіць гэтае пытаньне на сходах партколектываў і ячэек, абгаварыць конкрэтны плян організацыі вучобы, які-б забясьпечыў абавязкова поўны ахоп кандыдатаў і маладых членаў партыі, сыстэматычна правяраць ход партвучобы' дапамагаць у працы, падрыхтаваць і масава правесьці дзень вучобы, згодна дырэктыў ЦК КП(б)Б.

*) Друкуецца ў скарочаным выглядзе.

Аб'ява

Зьлёт юнкораў-ударнікаў у сувязі з тым, што 31-га жніўня Менгарком КСМ праводзіць вечар сустрэчу Менскай комсамоліі з авіо-атрадам, пераносіцца. Аб тэрміне скліканьня будзе паведамлена асобна.

Рэдакцыя „ЧЗ".

КОМСАМОЛЬСКІ ЦЭХ ФАБРЫКІ „1 МАЯ“ БУДЗЕ НА ГАСПАДАРЧЫМ РАЗРАХУНКУ

Пастанова ЦК УсеЛКСМ аб пераводзе да 17 МЮД'у ўсіх комсамольскіх ударных брыгад на гаспадарчы разрахунак павінна быць выканана

Ударная гаспадарча-разрахунковая брыгада зьяўляецца вышэйшай формай соцспаборніцтва і адыгрывае вялізарную ролю ў справе ўкараненьня гаспадарчага разрахунку ва ўсю прамысловасьць.

Раней зьмешчаны на старонках „Чырвонай Зьмены“ матар'ял аб выніках працы гаспадарча-разрахунковых брыгад тарпянікаў Асінторпу, яскрава сьведчыць аб тым, што ў галіне выкананьня колькасных і якасных паказчыкаў прамфінпляну ёсьць значныя дасягненьні.

Сёньнешні матар'ял з рымарнай фабрыкі „1-га мая“ паказвае прыклады практычнага праламленьня гістарычнай, прамовы тав. Сталіна комсамольскім колектывам у падарунак 17 МЮДу.

Гаспадарча-разрахунковы цэх да 17 МЮД'у

Адміністрацыя рымарнай фабрыкі „1-га мая“ не праводзіць практычнай працы па пераводу паасобных брыгад, цэхаў і фабрыкі ў цэлым на гаспадарчы разрахунак. Пастановы па гэтаму пытаньню партколектыву і фабкому ня выконваюцца

Адміністрацыя спасылаецца на об'ектыўныя прычыны: немагчымасьць перавесьці фабрыку на гаспадарчы разрахунак толькі з-за „адсталасьці і непрыстасаванасьці“ бухгальтэрыі, якая ня зможа даваць, па іх думцы, каротка-тэрміновыя якасныя паказчыкі (зьніжэньне сабекошту і г. д.), надзвычайна неабходныя для гаспадарча-разрахунковага дагавору.

Комсамольскі колектыў руйнуе об'ектыўныя немагчымасьці адміністрацыі. Складзена плянава-опэрацыйная брыгада з 6 асоб, якая вывучае перавод комсамольскага цэху на гаспадарчы разрахунак да 17 МЮД'у.

Дзейны ўдзел у гэтай працы плянава-опэрацыйнай брыгады прымаюць спэцыялістыя з Дзяржпляну. Пры іх удзеле брыгада вызначыла неабходны матар'ял для дагавору: аб валавой продукцыі, неабходнай сыравіне, колькасьці рабочых, вытворчасьці працы і інш.

Орыентовачны матар'ял перанесен на абгаварэньне рабочых у цэх. Рабочыя высоўваюць сустрэчныя прапановы—лічбы, значна перавышаючыя плянавыя меркаваньні брыгады.

На аснове сустрэчных лічбаў, комсамольскі цэх у бліжэйшыя дні складзе соцыялістычна-гаспадарчы разрахунковы дагавор з адміністрацыяй фабрыкі.

Трэба з усёй выразнасьцю адзначыць той факт, што комсамольскай плянава-опэрацыйнай брыгадзе на працягу яе працы не дапамаглі плянавыя работнікі фабрыкі. Незацікаўленасьць і пасыўнасьць праявілі яны ў пераводзе комсамольскага цэху на гаспадарчы разрахунак.

Комсамольскі колектыў фабрыкі „1-га мая“ ня спыніцца на адным комсамольска-гаспадарча-разрахунковым цэху. Усе цэхі перавесьці на гаспадарчы разрахунак—неадкладная задача працы комсамольскага колектыву.

Б. Сідэрман.

Гаспадарчы разрахунак—у брыгаду

Віцебск. Комсамольская організацыя фабрыкі „Сьцяг Індустрыялізацыі“ паказала сапраўды бальшавіцкія тэмпы ў выкананьні прамфінпляну. Довадам гэтага зьяўляецца 8-я комсамольская істужка, датэрмінова выканаўшая вытворчую програму другога паўгодзьдзя, і комсамольскі вучастак закройнага цэху, які сыстэматычна перавыконвае свой прамфінплян.

Але зараз 8-я комсамольская істужка, другая маладзёжная, і комсамольскі вучастак закройнага цэху знаходзіцца ў палоне прарыву.


Вытворчую програму за ліпень месяц швэйны гігант выканаў на 82 проц., а за першую дэкаду жніўня на 85 проц. Прычына такога ганебнага прарыву тлумачыцца тым, што адміністрацыйна-тэхнічны пэрсонал ня ўмее працаваць і кіраваць па-новаму, што брыгады і цэхі не пераведзены на гаспадарчы разрахунак.

Зараз па фабрыцы абвешчан двух дэкаднік штурму ліквідацыі прарыву. На працягу 20 штурмавых дзён комсамолія фабрыкі павінна пераключыцца на ўдарныя тэмпы працы, перабудаваць працу згодна 6 умоў тав. Сталіна.

Падрыхтоўка да 17 МЮД'у павінна прайсьці пад знакам барацьбы за хутчэйшае ажыцьцяўленьне паказаньняў тав. Сталіна ў яго апошняй прамове, якія зьяўляюцца неабходнымі ўмовамі выкананьня прамфінпляну.

Да 17-га МЮД'у комсамольская організацыя павінна прыйсьці з ударнымі акомсамоленымі маладзёжнымі гаспадарча-разрахунковымі брыгадамі.

Зэліксон Б.



Ад штабу па збору папяровай макулатуры

31 жніўня, а 5-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні рэдакцыі „Чырвоная Зьмена“ склікаецца паседжаньне штабу па збору папяровай макулатуры.

На паседжаньне выклікаюцца т. т. Маеўскі Рузаў, Ханін, Перэльман, Бабушкін, Мільток, Валынскі, Гімельштэйн, Сарокін і Шышкаў.

У сувязі з важнасьцю пытаньня яўка абавязкова.

Штаб.

ПА-УДАРНАМУ ПРАЦЯГВАЦЬ БАРАЦЬБУ ЗА СІЛОС

Выкананьне пляну будаўніцтва сілосных установак і сілосаваньне ганебнейшым чынам зрываецца.

Злачынная недаацэнка сілосаваньня кармоў, безадказнасьць і паўнейшая бязьдзейнасьць раду гаспадарчых, партыйных і комсамольскіх організацый—вось асноўныя перашкоды ў выкананьні пляну сілосаваньня.

Мы настойліва і катэгорычна патрабуем ад усіх комсамольскіх організацый безадкладна кінуць свае сілы на адстаючыя вучасткі барацьбы за сілос, узмацніць слабыя зьвеньні сваёй работы

Выязная рэдакцыя „Чырвонай Зьмены“

Зламаць опортуністычныя рагаткі на шляху сілосаваньня

Дзень сілосу, праведзены на Дрысенскім раёне, зрабіў значны зрух у справе сілосаваньня. За гэты дзень выкананьне пляну сілосаваньня ўзрасло з 6 проц. да 13,9 проц. На 20-VIII-31 г. у раёне закладзена 1110 тон сілосу.

Аднак, гэты процант выкананьня сілосаваньня ні ў якім разе ня можа задаволіць нас. Сілосаваньне ў Дрысенскім раёне ўсё яшчэ знаходзіцца ў катастрофічным стане. Толькі паасобныя саўгасы і колгасы раёну, якія ўлічылі гаспадарча-палітычную важнасьць сілосаваньня, дабіліся значных перамог на гэтым фронце.

Колгас Сталіна на 20-VIII-31 г. засілосаваў 83 тоны, комуна „Маяк“ Сар'янскага с-с. засілосавала 120 тон, колгас Варашылава засілосаваў 83 тоны, колгас „Ленінскі шлях“ 50 тон.

Паасобныя с-с опортуністычна недаацэньваюць сілосаваньня, чым сусім яго зрываюць. У Дзерназінскім с-с. ні адзін з пяці колгасаў не прыступіў да сілосаваньня. Сельсавет на месцы бязьдзейнічае і ніякіх указаньняў і дапамогі ў правядзеньні сілосаваньня не дае.

Такое-ж становішча і ў колгасе Калініна Валынецкага с-с і колгасе Будзёнага Прудзінкаўскага с-с. Гэтыя колгасы пад шыльдай об'ектыўных прычын, як адсутнасьць рабсілы і іншае, злачынна зрываюць сілосаваньне. Ліпенскі плян поўнасьцю сарвалі. Зараз сілосныя культуры перасьпяваюць, а праўленьні колгасаў опортуністычна бязьдзейнічаюць.

У малочна-таварных фэрмах сілосаваньне, адна з важных і важнейшых задач малочнай гаспадаркі, таксама зрываецца. У раёне 17 малочна-таварных фэрм. Жывёла забясьпечана харчамі ўсяго на 70 проц., але фэрмы яшчэ не прыступілі да сілосаваньня. Малочна-таварнай фэрме „Новы шлях“ натрэбна закласьці 400 тон сілосу, фэрме колгасу Комінтэрн Цястоўскага с-с, па пляну неабходна засілосаваць 100 тон, фэрме Дзяржынскага 194 тоны, фэрме „Комінтэрн“ Валынецкага с-с, 200 тон, але да сілосаваньня яны яшчэ не прыступілі.

Вялікая доля віны ў зрыве сілосаваньня ў гэтых фэрмах і наогул па ўсім Дрысенскім раёне прыпадае на Наркомзем і Колгасцэнтр. Яны ўвесь час абяцалі забясьпечыць будаўніцтва сілосных вежаў і траншэй належнымі матар'яламі (клёпкі, цэмант і інш.). Зараз у радзе комун і колгасаў выведзены падмуркі, каб працягваць будаўніцтва патрэбны клёпкі і цэмант. І вось Белколгасцэнтр і Наркомзем шлюць цяпер паперкі аб тым, што яны не могуць даць гэтых матар'ялаў. У выніку гэтага галавацяпства будаўніцтва веж і траншэй зрываецца ў колгасе Сталіна, Комінтэрн, Надзея, Новы шлях, Клімаўшчына і інш., дзе падмуркі ўжо выведзены і чакаюць матар'ялаў. Белколгасцэнтр і Наркомзем, мабыць зусім забыліся аб тым, што Дрысеншчына зьяўляецца ня толькі ільнаводным, але і малочна-жывёлагадоўчым раёнам, і што зрыў будаўніцтва траншэй зрывае само сілосаваньне.

Партыйныя яч. на мясцох мала аддаюць увагі сілосаваньню. Яны лічаць што гэта справа іх мала датычыць і не клапоцяцца сгарыстаць усе магчымасьці і рэсурсы на рашучы паварот у справе сілосаваньня.

Казлоў, Канончык.

Разьбіць кулацкую агітацыю аб непатрэбе сілосаваньня

РАГАЧОЎ. Рагачоўскі р-н павінен засілосаваць у гэтым годзе 11659 тон, засіласавана-ж толькі 182 тоны, што складае 1,6 проц. Гэта тлумачыцца тым, што большасьцю колгасаў Рагачоўшчыны сілосаваньне опортуністычна недаацэньваецца. Напрыклад, у комуне „Іскра“ (Кісьцянёўскага с-с, да закладкі сілосу прыступаць яшчэ і ня думаюць. А ўсе ўмовы для гэтага ёсьць: падрыхтавана яма на 400 пудоў, засеяна шмат сілосных культур, многа годнага для сілосаваньня зельля.

Тое-ж самае ў колгасе „Дняпроўец“ (Кісьцянёўскага с-с). Для закладкі сілосу ўсё падрыхтавана, але старшыня колгасу т. Балабаеў М. заяўляе: „у нас няма чаго сілосаваць“ (!!).

Сярод колгасьнікаў колгасу „Залозьзе“ Кісьцянёўскага с-с пануе такая думка:—„Сёлета добры ўраджай на сена—кармоў хопіць. Значыць сілосаваньня ніякага непатрэбна“.

Праўленьне колгасу „Залозьзе“ ня толькі ня імкнецца разьбіць гэтую кулацкую думку, а сваёю злачыннай бязьдзейнасьцю ганебна зрывае сілосаваньне. Колгас не засілосаваў яшчэ ніводнага цэнтнэра кармоў.

Партыйная і комсамольская ячэйкі, таксама Кісьцянёўскі с-с абсолютна нічога ня ўжылі, каб растлумачыць колгасьнікам і аднаасобнікам значэньне сілосаваньня, пастановы партыі і ўраду па гэтаму пытаньню практычна дапамагчы выканаць плян.

Вось кароткі, але даволі яскравы малюнак стану сілосаваньня па колгасах Рагачоўскага р-ну.

Опортуністычная недаацэнка значэньня сілосаваньня з праўленцамі колгасаў, партыйнымі і комсамольскімі ячэйкамі, панаваньне яўна кулацкай шкоднай думкі сярод значнай часткі колгасьнікаў, нежаданьне рамантаваць і будаваць сілосныя ўстаноўкі,—вось галоўныя прычыны зрыву пляну сілосаваньня.

Семянцоў С.

СІЛОСАВАНЬНЕ ПРАВАЛЕНА

Комсамольская ячэйка Курганіцкага с-с, Кармянскага р-ну, плян сілосаваньня праваділа: не запоўнена яшчэ сілоснай масай ніводнае ямы, ды і пачынаць сілосаваньне ня зьбіраюцца.

Каменская Кучанская і Янаўская ячэйкі КСМ павінны ліквідаваць прарывы ў сіласаваньні, напружанай ударнай работай.

Герасіменка Я.

Да суровай адказнасьці вінавайцаў зрыву

У колгасе „Чырвоная зьвязда“, Цацерынскага сельсавету, Бялыніцкага раёну, яшчэ дагэтуль не засілосавана ні аднаго кілё корму.

Старшыня колгасу і сэкратар кажуць:—„Мы сілос ня будзем закладаць да таго часу, пакуль не зьбярэм бульбянік, інакш у нас няма чаго закладаць“, (?!)

Такія яўна опортуністычныя адносіны праўленьня колгасу да справы сілосаваньня зрываюць выкананьне плану.

Ванюшоў.

Выступаем у паход за гарбэдж

22-VIII-31 г. адбылася склікаеная ЦК ЛКСМБ і рэдакцыяй „Чырвонай зьмены“ пашыраная нарада аб паходзе за збор гарбэджу. На нарадзе прысутнічалі прадстаўнікі Сьвінаводтрэсту, Сьвінаводколгасцэнтру Белкоопсаюзу, МЦРК Белхарчу, Гаркому КСМ і інш

Падрабязны матар'ял аб нарадзе і мерапрыемствах па правядзеньню паходу за гарбэдж будзе зьмешчаны ў наступных нумарох „Ч. З.

Барысаўшчына ідзе ў наступ

Плян сілосаваньня Барысаўскім р-нам выконваецца надзвычайна марудна. Большасьць колгасаў не прыступала да сілосаваньня. Яшчэ горш у аднаасобным сэктары.

Раённы камітэт комсамолу 23 жніўня склікаў спэцыяльную нараду сэкратароў комсамольскіх ячэек па пытаньню падрыхтоўкі да 17 МЮД'у, дзе асабліва была завострана ўвага на сілосаваньні.

Раённы камітэт ЛКСМБ абвясьціў баявы штурм па сілосаваньню.

Агісты

Яны дрэнныя шэфы будаўніцтва

16 жніўня было дадзена слова ў спрэчках на прадмюдаўскай завочнай нарадзе сэкратару Гарадоцкага РК КСМ тав. Грышко, сэкратару Вушацкага РК тав. Лісаўку і раду сэкратароў ячэек, дзе будуюцца ільназаводы.

Мінула больш тыдня, але дагэтуль не „соизволили“ выступіць у спрэчках. Гэта значыць, што таварышы, якім дадзена слова, адмовіліся выступаць. Гэта значыць, што яны ня хочуць лічыцца з газэтай, з тысячным чытачом з грамадзкасьцю, перад якімі яны павінны былі сказаць як шэфствуе над будаўніцтвам ільназаводаў комсамольская організацыя, якой яны кіруюць гэта значыць, што прарыў у будаўніцтве заводаў яны ліквідаваць ня думаюць.

Даводзячы аб гэтым да ведама ЦК ЛКСМБ, Гарадоцкага і Вушацкага РКК і нашых чытачоў, даем ім слова ў спрэчках у другі раз.

ГРОЗНЫМ АДКАЗАМ НА ВОРАЖЫ КРОК ДА ЧАСУ УЗЬВЕСЬЦІ НАДЗЕЙНЫ КУРОК

Тарас Хадкевіч

Прызыўніку

Таварыш, ты чуеш
настойлівы заклік,
оркестраў медзяных
музычную замяць?
Ты чуеш трывогі
навісшай павеў?
Ты бачыш; трывога
здалёку плыве?
І даль ахінаецца
шызым туманам.
Пагрозай расьце
навальнічная хмара.

Сьмяротнаю зданьню
над сьветам расьце
драпежнай вайны
ваяўнічая цень.
То чорная зграя
выконвае мэту:
заносіць сякеру
над краем саветаў

Гарматамі, Танкамі,
броньню машын
жадае краіну
стаптаць, прыду
шыць,

Але ад няўдачы
Зубамі скавыча...
Ля межаў чырвоных
стаяць вартавыя,
Чырвоная Зорка
ірдзее наўкол,
Як сымбаль ідучых
вялікіх вякоў.

Таварыш! У шэрагах
моцных і роўных
Ты рапартам скажаш
—„гатоў к абароне"

Ты станеш, таварыш,
такім вартавым,
каб вухам лавіць
на-ат шолах травы.
Каб варожым дзеем
заўсёды гатовым
трымаць, шанаваць
баявую вінтоўку.

Каб грозным адказам
на варожы крок
да часу узьвесьці
надзейны курок,
І мы, апавітыя
працаю творчай,
з табою таксама
за межамі сочым.
І хай хто прабуе
вайною пажыць,
мы станем сьцяною
на варце мяжы.

23 жніўня 1931 г.
г. Менск.

„Чырвоная Зьмена" у № ад 12-га ліпеня патрабавала, каб пісьменьнікі БССР уключыліся ва ўсебеларускі паход за клясава-сьвядомае і пісьменнае папаўненьне РСЧА, каб яны мобілізаваліся на адбіцьцё ў пролетарскай літаратуры вялізарных задач прызыву трэцяга рашаючага, вялізарных задач умацаваньня абароназдольнасьці нашае краіны.

Рад таварышоў ужо адгукнуліся на наш выклік. Сёньня мы друкуем творы белаппаўцаў П. Броўкі, Т. Хадкевіча і В. Таўлая, якія мобілізаваліся на аплату „чырвоназьменаўскага" рахунку.

Разам з тым, мы яшчэ раз патрабуем ад пісьменьніцкіх організацый і ў першую чаргу БелЛАЧАФ'у, хутчэйшага падвышэньня свайго ўдзелу ў паходзе за паўнацэнны прызыў, за ўмацаваньне абароназдольнасьці дыктатуры пролетарыяту.

В. Таўлай

Вінтоўкі ня будуць маўчаць...

(Нарыс пра новабранцаў у белапольскую армію)

Ужо больш чым месяц на Васіля наводзіў нейкі дзікі спалох грозны плякат:

„Pobór 1909-go rocznika"*)

Спачатку, калі яшчэ шмат здён заставалася да таго грознага, ракавога моманту, Васіль мог забыцца аб тым што скора прыдзецца яму надоўга разьвітацца з сям'ей, з хатай з вёскай. Але дні беглі. З кожнай гадзінай, з кожнай хвілінай усё шпарчэй і шпарчэй. Ад іх бегу Васілю пачыналася кружыцца ў галаве. Ён цэлымі днямі хадзіў, як п'яны. Праца валілася з рук. Усе дзівіліся. Па вёсцы поўзалі чуткі;

— Васіль звар'яцеў...

Міналі дні, як сон. І жыў Васіль у нейкім дзіўным сьне, у нейкай тупой апатыі да ўсяго, што ён бачыў вакол сябе, і нават да самога жыцьця. Здавалася, што ён Васіль забыўся і аб самой арміі. Ён проста хадзіў і спаў. Толькі вочы былі шырока адкрыты, як у чалавека, які ўпяршыню пабачыў сьвет.

І толькі адно будзіла Васіля. Калі перад яго шырока адкрытымі вачыма вырастаў грозны плякат, ён раптоўна ажыўляўся.

Плякат чорнымі, як сьмерць, літарамі ўразаўся ў кожны нэрв, узьнімаючы ва ўсёй істоце дзікую стыхію зьвярынага спалоху.

А вось, што было аднойчы. Васіль у гміну вазіў нейкага чыноўніка. Ліў як з цэбра, дождж. Мокры, як з вады, пужліва азіраючыся, увайшоў Васіль у прыёмную. З процілеглай сьцяны яго прабілі наскрозь ядавітыя штыкі літар:

Pobór 1909-go rocznika

Васіль з расчыненымі па-дзіцячаму вуснамі стаяў, як укопаны, пасярод прыёмнай, а са сьцяны злосна сьмяяўся плякат. Васілю нават здалося, што гэта не плякат. Гэта выскаліў зубы злосны афіцэр. З пенай на вуснах падае ён каманду. Вось замахнуўся каб ударыць „рэкрута" „в мордэн". З напоўмёртвага становішча разбудзіў Васіля начальскі крык.

— Хамская морда! Чаго вочы мазоліш, варона! Вон!

Гэта роў пан войт.

* * *

Колькі сьлёз выліла бедная Васілёвая маці. Колькі гарачых сьлез!..

— Васіля забіраюць... Адзіную надзею і дапамогу.. Нават гэтыя няшчасныя тры дзесяціны зямелькі ня будзе каму абрабіць.

Сама маці старэнькая. Бацькі—няма памёр падчас вайны. Старэйшай дачушцы—толькі 16 гадкоў. Сыну—14.

— А Васіль такі стыдлівы, такі слабы, як ён будзе служыць у гэтай страшнай арміі.

І плакала маці...

* * *

Надыходзіў ракавы дзень. Адзінаццаць хлапцоў з вёскі Лявонавічы ішло ў войска. Ад бравай моладзі адрывалася 11 таварышоў юных гадоў. Гэты дзень—дзень надзвычайны. Ён панурымі чорнымі хварбамі выдзяляецца на фоне шэрай штодзённасьці. Шкада 11 хлапцоў. Якая доля іх чакае ў гэта паганай белай арміі. Шкада.

* * *

Глыбока ў вясковых нетрах білася сэрца вёскі. Гэта загнанае у глыбокае падпольле працавала комсамольская ячэйка. Раўнамерна дзень у дзень дымныя рабочыя цэнтры гаварылі вуснамі комсамольскай ячэйкі з сялянскай стыхіяй, організавалі яе і гартавалі да заўтрашніх рашаючых баёў.

Білася сэрца вёскі.

Сёньня у адной з самых крывых хат сабраўся штаб моладзі — баявая комсамольская ячэйка.

На парадку дня-

праводзіны таварышоў-навабранцаў Сярод новабранцаў — 3 комсамольцы Юзка, Міхась і Якім. Ціха каротка і конкрэтна, без мудрых слоў выраталася надзвычайна важная справа.

Хатку—цэнтр штаба—ахоўвала свая варта, Сыгналаў няма.

Значыць—усё добра.

Білася сэрца вёскі.

* * *

Нядзеля. Пагода надзвычайна прыгожая. Сонца хіліцца за небасхіл. У азначанае месца пачалі прыбываць групы моладзі. Частка іх з клункамі ў руках. Гэта — новабранцы. Іх каля 50 чалавек Больш чым 200 чалавек моладзі з трэпэтам сэрца чакала пачатку. Гэта—першыя такія ўрачыстыя праводзіны. Добра растаўленая варта зорка аглядала ваколіцы.

— Пачынаем, таварышы! — азваўся адзін з комсамольцаў. — Слова мае таварыш з гораду.

На невялічкі ўзгорак, як на трыбуну, ўвайшоў пажылых гадоў чалавек Усе напружана чакалі.

— Мы прышлі правесьці вас, дарагія таварышы - новабранцы. Вось паглядзеце, кругом вашы браты і сёстры па нядолі, па цяжкім бядняцкім жыцьці Усе мы—адна сям'я.

Ціха шумеў лес. Горда сталі на варце сосны.

— Таварышы! Вось вы—навабранцы. Вас забіраюць у белую армію, у армію нашага клясавага ворага. Капіталісты і абшарнікі думаюць, што калі вас апрануць у жаўнерскі мундзір—вы згубіце ўсякую сувязь з намі, з вашымі роднымі братамі па клясе. Паны думаюць. што даволі вам кінуць гнеўную афіцэрскую каманду—вы пакорна пойдзеце крышыць галовы сваім братом на дэмонстрацыях; што вы пакорна прымеце пад час вайны на сябе лёс „гарматнага мяса".

— Памыляюцца паны!—адазвалася некалькі галасоў.

— Я таксама думаю, што памыляюцца!

Шумеў лес. Чулася дыханьне моладзі, гарачае, прыдушанае. Пранёсься лёгенькі вецярок. Мацней загамавіў лес.

— Таварышы, мы пэўны, што за сьценамі казармаў не перастане біцца салідарнасьцю рабоча-сялянскае сэрца. Вам ворагі дадуць у рукі вінтоўкі, каб вы баранілі іх багацьце і сваю нядолю. Мы пэўны што калі на вуліцах, на барыкадах будзе вырашацца лёзунг „хто каго", калі партыя нашая павядзе шырокія масы на апошні рашучы бой, вы накіруеце свае вінтоўкі супроць нашага супольнага ворага.

(Працяг будзе).

*) Набор 1909-га году



1. Кароткія абрысы вайны

Гэта ізноў паграажае—
Яна,—
узброеная да зубоў
вайна...
І я спазнаю—
гэта
Яна—
Машынай калек
выходзіць
Вайна.
Бацькоў і братоў
на сьмерць
заганяць,
Машынай сірот
выходзіць
вайна.
*Дык вось
калі зноў
пагражае
Яна—
Узброеная да зубоў
вайна.*
Рыхтуйся, таварыш,
так шугануць—
гэтую вайну!
Каб усюды
прадвесьнікам вол
яна—
выходзіла вайна.
Каб бокам мінула
нашы палі—
агідная вайна,
Каб ворагу вечна былі
кастылі,
Тыя, што судзіць
нам.

Толькі малы процант таго, чым жывем

Так
яшчэ ніколі
не праходзіць дзень,
як праходзіць
цяпер у нас.
Ты ціхага мейсца
ня знойдзеш
нідзе
У які сабе хочаш
час.
Ніколі жаданьням тваім
не астыць,
што розум
запаліў:—
Цэлыя суткі
горад грыміць,
бясконца зьвінаць
палі.
І вось
на вачох—
узрастае паверх
Шліфоўкі,
на дзіва гладкай.
Мурошчыкі нашы
узялі верх,
На хуткасьць
і якасьць кладкі.
Калі-ж,
мы прыродзе
даем заказ—
лягчэй нападам...
Вятры
цамавтоўку сушаць
у нас
і вецер адносіць
шлак.
Часта
і месяц
Трактар вядзе
і на ральлі гасьціць.
Нам не хапае
сонца ў дзень—
Трэба і ў ноч
расьці!
І кожнае раньне
да позьняй зары
Мы творчым жывём
быцьцём—
Мы і расьцем,
мы і гарым—
Такое
ў нас
жыцьцё!
*Дык няхай паспрабуюць-
чэрці цьвёрдалобыя
Што яны надумалі
Ды сваімі думамі.
Ім пакажа кожан:—
„Можа аж да можа"*
Дык гэта ізноў
паграажае
Яна—
Узброеная да зубоў
вайна
Рыхтуйся, таварышы,
так шугануць—
гэтую вайну!
Каб усюды
прадвесьнікам волі яна—
выходзіла вайна.
г. Менск

2. Некалькі строф да заходніх таварышоў.

Вы яшчэ, таварышы,
кроў сваю
ня змылі;
Гэта з першым жніўнем
прывітаў вас
кат.
Батам-жа,
гумовыя гутаркі,
абрыдлі,
Распачаць ім хочацца
гутарку гармат.
Хіба да спадобы ім
нашы справы
сьмелыя,
Што расьце краіна
моцнай што граніт.
На ўсьцяж ад Кіева
аж да Нагарэлага—
Нас пужаюць дуламі
польскія паны.
*Што яны надумалі
ды сваімі дуламі;—
панскія загоншчыкі,
чортавы пагоншчыкі.
Ці ня гэта можа?
„Ад можа да можа"*

На вечары сустрэчы комсамолії Менску з МенАППам

28-га жніўня у Доме Камасьветы адбыўся МЮД'аўскі вечар сустрэчы комсамолії Менску з БелАППам, Адчыніла вечар заг. культпроп Менгаркому т. Фрумкіна.

На трыбуне зьяўляецца сэкратар БелАПП'у т. Пл. Галавач. спатканы гарачымі воплескамі.

— Пачын Гаркому ЛКСМБ па органічнаму ўмацаваньню сувязі комсамола з БелАПП'ам і прызыву ударнікаў у літаратуру гаворыць т. Галавач-патрэбна вітаць.

— Вялізарную ролю адрыгрывае літаратура ў клясавай барацьбе, ў выхаваньні новых людзей.

Мы маем буйныя посьпехі ў барацьбе за гегемонію пролетарскай літаратуры. Вялікую ўвагу мы павінны аддаць справе падрыхтоўкі і літаратурных кадраў. У нас у літаратуры яшчэ зусім малы лік рабочых непасрэдна ад варштату і віна ў гэтым ня толькі БелАПП'у, але комсамолу, профсаюзаў. Комсамол выгадаваў і Галавача і іншых, але іх лесам ня цікавіўся. Далей т. Галавач дае малюнак, як малады пісьменьнік, часта не атрымліваючы дапамогі ад комсамольскай організацыі, адыходзіць ад яе.

„Чырвоная Зьмена" актыўна змагаецца за выхаваньне літаратурных кадраў з маладняка, за выкананьне задач, стаячых перад пролетарскай літаратурай. Гэта змаганьне патрэбна яшчэ шырэй рапартаваць.

Далей тав. Галавач адзначае:

— Менская комсамолія па-баявому бярэцца за заклік ударнікаў у літаратуру. Пры выкананьні гэтае задачы мы будзем мець магчымасьць у 18 МЮД слухаць сваіх комсамольскіх пісьменьнікаў.

Аб ходзе закліку ударнікаў у літаратуру па Менску гаварыў т. Кучар (Сэкратарыят МенАПП).

— Комсамольскія колектывы яшчэ безадказна адносяцца да закліку ўдарнікаў у літаратуру яны ня цікавяцца працаю гурткоў існуючых на іх прадпрыемствах,

Да 17 МЮД'у колектывы Менску павінны выдзяліць лепшых ударнікаў комсамольцаў у літаратурныя гурткі. Колектывы выдавецтваў, тэхнікумаў павінны вылучыць лепшых комсамольцаў для організацыі і кіраўніцтва літгурткамі на прадпрыемствах.

Тав. Маўр (БДзВ) зьвярнуў увагу прысутных на пытаньні дзіцячай і юнацкай літаратуры.

Прадстаўнік „Ч. З." тав, Вярнікоўскі гаворыць, што МЮДаўская сустрэча комсамолії з БелАППАМ зьяўляецца адным з практычных мерапрыемстваў Менскай комсамолії па выкананьню пастаноў кантрольнага пленуму ЦК ЛКСМБ аб удзеле комсамолу ў будаўніцтве пролетарскай літаратуры, аб стварэньні комсамольскай мастацкай літаратуры.

Адна справа напісаць кнігу,—гаворыць тав. Клейнэр,—другая справа давесьці яе да чытача. А давесьці яе патрэбна да кожнага колгасьніка на палёх, да кожнага варштата. І ў гэтым пэўны абавязак павінен узяць на сябе комсамол.

Рапарт літаратурнага гуртка заводу Варашылава перадае ўдарнік, заклікаsuccessfully ны ў літаратуру,—тав. С. Шаўцоў.

— Гурток організаваўся ўжо 5 месяцаў. Спачатку запісалася 20 чал. Заняткі праводзім рэгулярна, адзін раз у пяцідзёнку, вывучаем тэхніку пісаньня нарысаў, апавяданьняў, артыкулаў.

Нашы ўдарнікі Малашонак і Лейбман выдалі кніжку. якая дае малюнак ператварэньня бруднай сталоўкі ў сапраўдны цэх заводу. Нашы сябры гуртка друкуюцца ў часопісях і газэтах. Усе літгурткоўцы—актыўныя рабкоры заводзкага і цэнтральнага друку.

Аб становішчы закліку ўдарнікаў у літаратуру на фабрыцы „Кастрычнік" вершаваным фэльетонам на яўрэйскай мове расказаў пісьменьнік тав. Доўгапольскі.

Аб пастаноўцы працы ў літаратурным гуртку друкарні Сталіна рапартаваў тав. Ідэльчык.

На вечары пад гучныя воплескі зацьверджаны соцыялістычны дагавор паміж комсамолам Менску і МенАППам.

На сцэне поэта П. Броўка. Ён чытае свае „Слова ў комсамольскіх спрэчках". Адзін за адным чытаюць вершы тав. Юдэльсон (на яўрэйскай мове) Маракоў, Алесін, Бягун, На трыбуне зьяўляецца тав. Крапіва. Ён чытае байкі, вострыя, бічуючыя Канец яго байкі пакрываецца бурнымі воплескамі.

У падагульненьні мюдаўскага вечару Менскага комсамолу з МенАППам тав. Фрумкіна адзначае:

— Сёньнешняя сустрэча павінна пакласьці цьвёрды пачатак па закліку ўдарнікаў у літаратуру, дапамогі і кіраўніцтва імі і па стварэньню юнацкай літаратуры Заключаны сёньня дагавор узаемнае абавязацельства вызначыць для кожнага з нас месца ў барацьбе за гегемонію пролетарскай па зьместу і нацыянальнай па форме літаратуру.

В. Кавалевіч.

АД УРАЧЫСТАСЬЦІ І ПАЖАДАНЬНЯЎ ДА ДЗЕЛАВОЙ РАБОТЫ

акамсамолім паветраны—дзесяткамі, сотнямі камсамольцаў лётнікаў і камсамольскімі самалётамі

Аднэй з вызначаных 9 зьездам задач вайсковай работы зьяўляецца шэфства над паветраным флётам. Каб правесьці ў жыцьцё гэта шэфства, мы павінны забясьпечыць комплектаваньне паветрана-вайсковых школ комсамольцамі і ўвесьці сыстэматычнае вывучэньне тэхнікі лётнай справы, організуючы дзеля гэтага спэцыяльныя гурткі, школы і г. д. Аднак, шэфства ў нас пастаўлена яшчэ дрэнна, у выніку опортуністычнай недаацэнкі вайсковай справы. Ёсьць ячэйкі, якія ня ведаюць, як практычна наладзіць шэфства, а раённыя камітэты ім не дапамагаюць.

Менская організацыя практычна ўзялася ўжо за ажыцьцяўленьне шэфства. Організоўваецца вечар комсамольскай організацыі сумесна з падшэфнымі паветранымі часткамі па праверцы выкананьня ўзятых абавязкаў па шэфству. Прыклад Менску павінен быць падхоплены астатнімі організацыямі Беларусі.

Дзякуючы слабому разгортваньню работы, месячнік праверкі працягнуты да кастрычніка. Пад знакам праверкі стану шэфства над паветраным флётам і наогул вайсковай работы і пад знакам падрыхтоўкі да зімовай вучобы, практычна гэта вырашаецца організацыяй вучэбных вайсковых пунктаў.

Час падрыхтоўкі да МЮД'у павінен быць скарыстаны для разгортваньня месячніка праверкі. Самаправерка павінна ўзьняць тэмпы і якасьць вайсковай работы.

Пастанова бюро Менгаркому КСМ па шэфству над АВІО-атрадам

Заслухаўшы даклад камісара авіо-атраду аб ходзе летняй вучобы і становішчы шэфства, бюро Менгаркому КСМ адзначае:

1. Адсутнасьць практычнай працы на супрацоўніцтву з авіо-атрадам з боку гарадзкой організацыі КСМ. Прабываньне атраду не выкарыстоўвалася гаркомам для прапаганды ў справе падрыхтоўкі кадраў і азнаямленьня комсамольскай масы і беспартыйнай працоўнай моладзі з авіо-справай. Нерэгулярна праходзяць заняткі гурткоў (мотористых, фотолябор) колектывы, адкуль выдзелены комсамольцы, ня цікавіліся ходам заняткаў і адносінамі да іх комсамольцаў.

2. Пад кіраўніцтвам камандваньня і парторганізацыі на аснове комуністычных мэтодаў работы—соцспаборніцтва і ўдарніцтва—атрад дасяг значных вынікаў у справе падняцьця на прынцыповую вышыню баяздольнасьці атраду, выкананьня пляну летняй вучобы, умацаваньня вайсковай дысцыпліны і зусім здаровага політыка-моральнага стану. Разгортваньне рацыяналізатарскіх вынаходніцкіх работ накіравана на ўдасканаленьне баявой падрыхтоўкі. Лётны тэхнічны склад прыняў актыўны ўдзел у правядзеньні дэкадніка грамадзянскай авіяцыі шляхам выдзяленьня сваіх дакладчыкаў на фабрыкі і заводы, на аснове чаго бюро гаркому КСМ пастанаўляе:

Для разгортваньня штодзённай практычнай работы па шэфству, ставячы мэтай найбольш поўнае забясьпечаньне баявой падрыхтоўкі атраду, прымацаваць да атраду комсамольскія вытворчыя колектывы „Бальшавіка“, Варашылава, „Комунар“, „Кастрычніка“ і Белдзяржбуду, якім сумесна з авіо-атрадам выпрацаваць мерапрыемствы па супрацоўніцтву і працы. Сумесна з авіо-атрадам разгарнуць падрыхтоўчую працу да асеньняга набору ў лётна-тэхнічныя школы. Для прэміяваньня лепшых ударнікаў баявой падрыхтоўкі лётна-тэхнічнага складу выдзеліць адпаведны фонд. 31-га жніўня правесьці вечар сустрэчы комсамольцаў і беспартыйнай моладзі з авіо-атрадам, прапанаваўшы ваенработніку падрыхтаваць яго.



Сустрэча шэфа з падшэфным

Сёньня, а сёмай гадзіне, у клюбе імя Леніна (пасажырскі вакзал) адбудзецца наладжаны Менгаркомам ЛКСМБ вечар, сустрэчы комсамолу і рабочай моладзі Менску з падшэфным авіо-атрадам.

Комсамол—шэф вайскова-паветраных сіл РСЧА. Комсамол Менску яшчэ слаба ажыцьцяўляе сапраўднае шэфства. Колектывы на мясцох па-сапраўднаму не разгарнулі работы па збору сродкаў на авіо-будаўніцтва. Дрэнна праходзіць падрыхтоўка авіо-кадраў. Організаваныя ў колектывах гурткі па вывучэньню авіо справы большасьцю бязьдзейнічаюць.

Сустрэча падшэфнага з шэфам палажыць пачатак супольнай рабоце ў галіне набыцьця комсамоліяй авіа-пісьменнасьці, у галіне мацаваньня жалезнага фонду авіо будаўніцтва.

Комсамолец—на самалёт! Гэта баявы лёзунг усяго ленінскага комсамолу. Пачатак пасьлядоўнаму нясупыннаму ажыцьцяўленьню гэтага лёзунгу павінна палажыць і палажыць сустрэча комсамоліі і працоўнай моладзі Менску з сваім падшэфным.

Ліквідуем прарыў

Ваенізацыя комсамольскай організацыі Клімаўшчыны знаходзілася да апошняга часу ў заняпадзе з прычыны слабай работы і недаацэнкі вайсковай вучобы ячэйкамі,

Зараз, у парадку падрыхтоўкі да МЮДу, комсамол Клімаўшчыны ўключыўся ў самаправерку вайсковай работы.

Ш—да.

Шэфства—на вышэйшую ступень

Выкананьню рашэньняў IX зьезду УсеЛКСМ аб шэфстве над вайскова-паветранымі сіламі РСЧА Менская організацыя ЛКСМБ удзяляла недастаткова ўвагі.

Колектывы ЛКСМБ Менску не правялі практычнай работы з прышэфным авіо-атрадам. Гарком ЛКСМБ не змог скарыстаць лётна-тэхнічны склад авіо-брыгады для прапаганды авіо-справы і падрыхтоўкі авіо-кадраў. Аб гэтым заявіў і агульна-гарадзкі сход і бюро гаркому.

Рашэньня IX зьезду стварыць жалезны фонд абароны краіны да гэтага часу ні адзін колектыў Менску ня выконвае. Ня выконваецца разьвёрстка і па збору сродкаў на пабудову падводнай лодкі і зьвяна самалётаў.

Бюро гаркому вынесла пастанову: да 17 МЮД,у выканаць разьвёрстку па збору сродкаў. Гэтая пастанова, у парадку к падрыхтоўцы к 17 МЮД'у, павінна быць ажыцьцяўлена колектывамі.

Колектывы заводу „Комунар“, „Бальшавік“, Варашылава недастаткова ўдзяляюць увагі пытаньню падрыхтоўкі авіо-атрадаў. Створаныя авіо-гурткі на гэтых прадпрыемствах не атрымоўваюць кіраўніцтва ад колектываў ЛКСМБ, і права іх занепалае. У пытаньнях комплектаваньня лётных вайсковых школ комсамольская організацыя Менску разьвёрстку перавыканала.

Каб палепшыць работу па супольнай працы з авіо-атрадам, бюро гаркому намеціла рад мерапрыемстваў, якія павінны быцьператвораны ў конкрэтныя справы.

Патрэба правесьці прымацаваньне буйных колектываў да авіо-атрадаў, якія разам з атрадам змагаліся б разгарнуць работу ў сябе на мясцах.

Менская організацыя ЛКСМБ павінна ўключыцца ў ліквідацыю прарыву ў дапамозе вайскова-паветранаму флёту шляхам пастаноўкі на мясцох работы па збору сродкаў на падводную лодку і зьвяно самалётаў, шляхам організацыі ў о ных гуртках па вывучэньню авіо-справы. Да супольнай работы і патрэбна прыцягнуць авіо-атрад.

Д. Худыш

Крупкі—дээртыр вайсковай работы

У раёне 40 ячэек КСМ і ні адна з іх не прыступіла да вайсковай вучобы. Сэкратар РК КСМ тав. Літвінова тлумачыць гэта адсутнасьцю кіраўнікоў. Гэты адказ толькі лішні раз падкрэсьлівае наколькі сэкратар райкому ня цікавіцца вайсковай работай і ня ведае становішча ў раёне. Скончыўшых раённыя курсы па падрыхтоўцы кіраўнікоў вайсковых гурткоў райком комсамола ня здолеў скарыстаць. У раёне значная колькасьць дэмобілізаваных чырвонаармейцаў, сярод іх і комсамальцы, але яны нікім ня прыцягваюцца да работы. Таксама слаба ўдзельнічае КСМ організацыя ў рабоце асоавіяхэму. Крупская організацыя павінна ўключыцца ў самаправерку і гэтым узьняць тэмпы і якасьць вайсковай работы.

Лукашук.

Вучэбны пункт асноўнае зьвяно вайсковай вучобы

Па баявому разгорнем месячнік самаправеркі

Пастанова Бюро ЦК ЛКСМБ і ЦС Асоавіяхэму аб правядзеньні з 30-га жніўня 31 г. месячніка праверкі вайсковай работы комсамолу

Адзначыць, што большасьць райкамолаў і райсаветаў АСО яшчэ не прыступілі да конкрэтнай рэалізацыі пастаноў ЦК ЛКСМБ УсеЛКСМ і ЦСАСО СССР аб правядзеньні месячніку праверкі вайсковай работы комсамолу.

У сувязку з гэтым, ЦК і ЦС Асоавіяхэму пастанаўляюць:

1. Месячнік праверкі вайсковай работы працягнуць да 1-га кастрычніка. РК і райсаветам Асоавіяхэму зрабіць карэнны перолом у справе мобілізацыі комсамольскай асо-авіяхэмаўскай ор-цыі і шырокай савецкай грамадзкасьці на праверку рашэньняў IX-га зьезду Усе ЛКСМ і баявых маршрутаў ЦК.

2. Не пазьней як 1-га верасьня распачаць праверку вайсковых ведаў комсамольцаў кіруючыся ранейшым рашэньнем сэкратарыяту ЦК. Шырока разгарнуць масавую работу з асьвятленьнем у друку ходу і вынікаў праверкі, популярызаваць рашэньні зьездаў і пленумаў ЛКСМ і Асоавіяхэму, мобілізуючы ўвагу на замацаваньне дасягнутых вайсковых ведаў.

Прыняць усе захады да хутчэйшага афармленьня пераходу на вучэбныя пункты ў горадзе і на вёсцы і для вучобы на зімовы перыод 31-32 г. Вынікі індывідуальнай і ячэйкавай вайсковай работы шырока абгаварыць на сходах ячэек КСМ і Асоавіяхэму.

3. Аказаць максімальную ўвагу і дапамогу ваенкаматам з боку КСМ і асоавіяхэмаўскіх організацый у справе правядзеньня прызыву 1909 г., растлумачваючы сучаснае міжнароднае становішча і задачы абароны сав. будаўніцтва. Закон аб абавязковай службе забясьпечваць сваячасовы вайсковай і організаванай явкаю ў прызыўныя камісіі ўсіх падлягаючых прызыву, не дапушчаючы ў рады РСЧА клясава варожых і соцыяльна чужых элемэнтаў.

РК і райсаветам разам з райполіт. інспэктарамі і гаспадарча-кооперацыйнымі ор-цыямі забясьпечыць прызыўныя пункты матар'яльна-культурным абслугоўваньнем (харчаваньнем, газэтамі, кінотэатрам, організацыяй на гэты час каля прызыўных пунктаў кооперацыйных ларгі кіоскі, ціры, агітпалаткі і г. д.) Райкомам і райсаветам змагацца з такімі паводзінамі, калі за тыдзень два да адыходу ў РСЧА прызыўнік кідае прадпрыемства, або колгас, што зьяўляецца звычайнай з выкананьні промфінпляну, а таму неабходна правесьці па гэтаму пытаньню шырокую масава-політычную растлумачальную работу. Акрамя гэтага, завастрыць пытаньне перад усёй комсамольскай асоавіяхэмаўскай масай аб яшчэ больш шырокім іх удзеле ў чарговых гаспадарча-політычных кампаніях, якія праводзяцца партыяй і ўрадам па выкананьню промфінпляну, уборцы ўраджаю, насеўкампаніі, нарыхтоўках ўсякага віду, увысканьні падаткаў і інш.

4. Будучыя манэўры частак БВА павінны быць шырока популярызаваны на прадпрыемствах, у



саўгасах, колгасах і вёсках. Ком... мольскія і АСО організацыі павінны аказваць часткам Чырвонай арміі максімальную ўвагу і дапамогу ў правядзеньні манэўраў (організацыі вечароў-провадаў адыходзячым на манэўры часткам Чырвонай арміі, дапамога па перавозцы грузаў, організацыя сустрэч, абслугоўваньне на стаянках, дастаўка неабходнага харчаваньня, разьмяшчэньне на начлег, культурнае абслугоўваньне, організацыя агітпавозак, непасрэдны ўдзел у пачынцы мастоў, дарог, вылучэньне для аховы тэлеграфнай і тэлефоннай лініі правадніцкоў, вядчыкаў ... інш. мерапрыемстваў спрыяючых паспяховаму правядзеньню манэўраў), а таксама організацыю шырокай грамадзянскай ... выкананьне гаспадарча-політычных кампаній, організоўваючы масавыя чырвоныя абозы па здачы хлеба і інш. прадуктаў імя манэўраў, ім. Чырвонай арміі.

5. У перыяд месячніка работа ячэек, ... КСМ і АСО павінны праверыць выкананьне пастановы 9-га і 10-га зьезду ЛКСМ, а таксама 2-га АСО па шэфству над паветрана-марскім флётам, у прыватнасьці ці складзены дагаворы на соцспаборніцтва на гэтых пытаньнях, пагалыбляючы засягнутыя поспехі ў часе правядзеньня 2-й дэкадніка грамадзянскай авіяцыі.

6. На адным з кантрольных сэкратарыятаў ЦК і прэзыдыуму ЦС АСО заслухаць даклады двух РК КСМ і райсаветаў АСО аб правядзеньні месячніка.

7. Для кіраўніцтва месячнікам пры ЦК стварыць тройку у складзе т. т.: Гузікава—старшыня, Дрыльёнка—ЦС АСО, Пузікава—рэдакцыя „Чырвонай Зьмены“.

Вынікі месячніка па лініі КСМ прысылаць у ЦК, а па АСО у ЦС АСО да першага кастрычніка 1931 г.

ЦК ЛКСМБ

ЦС АСО Бел.

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТАЎ.

Слухайце, слухайце, слухайце!

3 верасьня, а 9-й гадзіне ўвечары—пашыраны радыёмітынг мюдаўскай камісіі з удзелам комсамольскага актыву.

На мітынгу ўдзельнічаюць:

Менгарком (2) хвіл.), друкарня імя Сталіна, завод Варашылава, „чырвоназьменаўская“ комуна, Віцебскі гаркамол (10 хв.), колектыў „Сьцяг індустрыялізацыі“, Магілеў (10 хв.), Барысаў (10 хв.), Койданава (10 хв.), ячэйка МТС, Слуцак (8 хв.), Бабруйскі РК (15 хв.), Тураў (8 хв.), Гомельскі РК (15 хв.), колектыў Гомсельмашу, Асінторп (10 хв.) Дрыса (12 хв.), райком і ячэйкі ільназаводу.

Падрабязнасьці ў „Чырвонай Зьмене“ № 200 (1469) ад 29-га жніўня 1931 г.

Друкарня імя тав. Сталіна.

Галоўлітбел № 599